40 260 10082

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

XXIII ГОДЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

№ 20

ЛЕНІНА

Янка Купала.

НАШАМУ СВЯТУ

Расчыні шырока дзверы,
Мілая старонка,
Выйдзі стрэнуць свой Кастрычнік
Песняй гулкай, звонкай!

Свята нашай гадавіны,
Хоць і ўвосень свята,
Свеціць вечнаю вясною
Нашым гоням, хатам.

Гэй вы, хлопцы, гэй, дзяўчаты,
Комсамол шчаслівы,
Сыпце кветкі, сыпце радасць
Нашым сёлам, нівам!

Перад намі ў сонцы, у зорах
Будучыня наша,
Кожны дзень сягоння лепшы
Як быў учарайшы.

Наша праца не йдзе марна
У полі, на заводзе,—
Аб здабытках, дасягненнях
Слава ходам ходзіць.

Мы не марамі сягаем
Высака пад неба,—
Самалёты—нашы птахі—
Даль вышынь цярэбяць.

Мы не пекла дасягаем
У зямлі глыбінах,
А багацце здабываюць
Нашыя машыны.

Нашы межы не баяцца
Здрадніцкіх напасцяў,
Мы сяўцы для чалавецтва
Яснай праўды, шчасця.

Нашых песень, светлых думак
Ніштo не зацемрыць—
Ні наганы, ні кайданы
Фашыстоўскай хэўры.

Мы ідзем у сонцы з сонцам
Маладым паходам.
Слава бацькаўшчыне нашай
І яе народам!

Слава сокалу, што родам
З-пад каўказскіх скалаў,
Што з Крэмля праменні сее
З юнацкім запалам!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 20. КАСТРЫЧНІК 1940 г.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 49, I паверх., тэл.—24053

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 2889. Тыраж 13.000 экз. У 4352.
Здана ў друк. 22/X—40 г. Падпісана да друку 31/X—40 г. У нумары 2½ друк. арк. 120.140 друк. знак.

В. І. Ленін і І. В. Сталін выходзяць з Смольнага (1917 г.) (Малюнак П. Васільева).

ДВАЦЦАЦЬ ТРЫ ГОДЫ БАРАЦЬБЫ І ПЕРАМОГ

Совецкі народ святкуе XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі. Кожная гадавіна Кастрычніка з'яўляецца велізарнейшай падзеяй у жыцці народа і краіны.

У гэтыя гістарычныя дні працоўныя падводзяць вынікі грандыёзных перамог на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, здабытыя пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна і намячаюць далейшыя шляхі барацьбы за яшчэ большае працвітанне нашай радзімы.

Кастрычніцкая Соцыялістычная Рэволюцыя і перамога соцыялізма ў нашай краіне былі ажыццёўлены пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі і яе геніяльных правадыроў Леніна і Сталіна.

У Совецкай Соцыялістычнай рэспубліцы пышным цветам расцвітае радаснае, свабоднае і багатае жыццё працоўных. Шырыцца дружба і адзінства народаў. Мацнее магутнасць краіны соцыялізма.

Зусім у другой абстаноўцы сустракае XXIII гадавіну Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі працоўны народ капіталістычных краін. Полымя другой імперыялістычнай вайны ахапіла зямны шар. Самыя буйныя краіны свету—Германія, Італія, Англія, Японія, Кітай і іншыя—уцягнуты ў крывавую бойню. Дзесяткі тысяч рабочых і сялян, жанчын, дзяцей, старыкоў гінуць ад паветраных бамбардыровак.

Драпежніцкая барацьба капіталістаў за перадзел свету і захоп рынкаў збыту кладзецца цяжарам на працоўных. Вайна апустошыла дзесяткі краін, і прывяла да голада мільёны людзей.

Празорлівая прадбачлівасць правадыра народаў вялікага Сталіна і совецкага ўрада забяспечваюць народам СССР мірнае жыццё.

Народы Совецкага Саюза заўсёды ўлічвалі і ўлічваюць указанні вялікага Сталіна аб капіталістычным акружэнні. Добра ўяўляюць сабе тую складанейшую міжнародную абстаноўку, у якой мы жывем. Вось чаму яны заўсёды гатовы да любых нечаканасцей. Гатовы разам з доблеснай Чырвонай Арміяй абрушыцца вялікай сілай супроць любога ворага.

Поспехі нашай радзімы за годы соцыялістычнай рэволюцыі выключна вялікія. Маладая совецкая краіна пасля Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі атрымала ў спадчыну разбураныя фабрыкі, заводы, спустошаную імперыялістычнай вайной сельскую гаспадарку. Рабочы клас і сялянства Совецкага Саюза не толькі аднавілі разбураную гаспадарку краіны, але і пабудавалі новую соцыялістычную гаспадарку такімі хуткімі тэмпамі, якіх не бачыў яшчэ свет.

За годы Совецкай улады, за годы Сталінскіх пяцігодак выраслі гіганты-заводы і фабрыкі. Наша прамысловасць выпускае прадукцыі ў некалькі дзесяткаў раз больш, чым у даваенны час.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі да непазнавальнасці змяніла жыццё сялянства. Культурна, радасна і заможна сталі жыць калгаснікі і калгасніцы. Яркім сведкай гэтага з'яўляецца Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка. На ёй два годы падрад дэманстрыруюцца перад усім светам грандыёзныя перамогі калгаснай гаспадаркі. Толькі калектыўная праца магла даць такія бліскучыя рэзультаты.

Культура і мастацтва краіны соцыялізма з кожным днём пышна расцвітае. Пабудаваны сотні тысяч новых школ, вышэйшых навучальных устаноў, тэхнікумаў.

БІБЛІЯТЭКА ЛЕНІНА

Хто не ведае колькі гора, здзекаў і знявагі пераносіла працоўная жанчына ў старыя часы? Становішча жанчын у капіталістычных краінах і зараз не лепшае. На жанчыну глядзяць там, як на рабыню. Яна пазбаўлена ўсіх эканамічных і палітычных правоў. На заводах і фабрыках за адну і тую-ж работу ёй плоцяць менш, чым мужчыне.

Толькі ў Совецкім Саюзе—у краіне соцыялізма жанчыны нараўне з мужчынамі карыстаюцца ўсімі правамі. Яны акружаны клопатамі партыі, урада і таварыша Сталіна. Іх дзеці вучацца ў школах, выхоўваюцца ў дзіцячых яслях, садах. Многадзетныя мацеры атрымліваюць дзяржаўную дапамогу на дзяцей.

Таварыш Ленін пісаў: «Наша задача састаіць у тым, каб зрабіць палітыку даступнай для кожнай працоўнай жанчыны» і далей «Совецкая ўлада імкнецца да таго, каб усе працоўныя, не толькі партыйныя, але і беспартыйныя, і не толькі мужчыны, але і жанчыны, прымалі ўдзел у гэтым гаспадарчым будаўніцтве. Гэта пачатая совецкай уладай справа можа быць рушана ўперад толькі тады, калі замест соцень жанчын па ўсёй Расіі ў ёй прымуць удзел мільёны і мільёны жанчын». Вялікія заветы генія народаў Владзіміра Ільіча Леніна ажыццяўляюцца ў нас поўнасцю.

Краіна сустракае вялікае свята ў мірных умовах і з велізарнымі поспехамі ў галіне знешняй палітыкі Совецкага ўрада. «Дзякуючы паслядоўнаму правядзенню сваёй мірнай знешняй палітыкі, нам удалася значна пашырыць свае пазіцыі і міжнародную вагу Совецкага Саюза» (Молатаў).

У рэзультаце гэтага працоўныя, натхнёныя палітыкай урада, у якасці падзякі за яе мудрыя рашэнні адказваюць нябачанай актыўнасцю ў барацьбе за выкананне і перавыкананне Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

На ўсіх фабрыках, заводах, калгасах і соўгасах разгарнулася перадкастрычніцкае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIII гадавіны Вялікай Соцыялістычнай Рэволюцыі. Вытворчыя падарункі працоўныя прападносяць радзіме-мацеры.

За год ад XXII да XXIII гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі адбыліся вялікія гістарычныя падзеі ў жыцці нашай краіны. У мінулым годзе ў гэты час вызвалены народ Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны толькі яшчэ рашаў пытанне аб устанаўленні ўлады. Напярэдадні Кастрычніцкіх урачыстасцей на Народных Сабраннях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны была абвешчана Совецкая ўлада. Вось ужо больш года, як свабодны народ заходніх абласцей БССР і УССР жыве пад праменнямі Сталінскай Канстытуцыі.

Бязмежны былі лікаванне і радасць народа, калі ў гэтым годзе наша краіна ўзбагацілася яшчэ 5 нацыянальнымі рэспублікамі. Радзіма выраслa да 193 мільёнаў насельніцтва. Такі цудоўны рост магчым толькі ў краіне соцыялізма, дзе ліквідаваны эксплаататарскія класы і ўсе сродкі, якія параджаюць эксплаатацыю чалавека чалавекам.

Мірную працу нашай радзімы зорка ахоўвае слаўная Чырвоная Армія і Чырвоны Марскі Флот. Яны авеялі сябе гераічнай славай у годы грамадзянскай вайны, у цудоўных подвігах у часе баёў каля возера Хасан, у часе вызвалення Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад іга паноў і капіталістаў, у абароне безапаснасці горада Леніна—у барацьбе з фінскімі белагвардзейцамі.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна народ Совецкага Саюза пабудаваў бясклассавае соцыялістычнае грамадства. Пад геніяльным кіраўніцтвам вялікага Сталіна працоўныя і надалей прыкладуць усе свае сілы для поўнага таржаства комунізма.

Няхай жыве Вялікая Кастрычніцкая Соцыялістычная Рэволюцыя!

Няхай жыве партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве вялікі Сталін!

Хор Брэсцкай друкарні імені Варашылава падрыхтаваў да 23 гадавіны Кастрычніка новую канцэртную праграму.
На здымку: Выступленне хора з перадсвяточнай праграмай па радыё праз станцыю імені Соўнаркома БССР.
Фота І. Лупейко (Фотахроніка БЕЛТА).

Дастойна сустрэнем выбары

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР на 15 снежня 1940 года назначаны выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях нашай рэспублікі.

Працоўныя заходніх абласцей сустрэлі гэты Указ з вялікім задавальненнем. Па прадпрыемствах, установах і вёсках праходзяць мітынгі, прысвечаныя пачатку выбарчай кампаніі. Простымі і шчырымі словамі прамоўцы дзякуюць партыю і ўрад за свабоднае, поўнае кіпучай дзейнасці жыццё.

Выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных будуць праходзіць на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. Усе грамадзяне БССР, якія дасягнулі 18 год, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, вераспавядання, адукацыі, соцыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і ранейшай дзейнасці маюць права выбіраць і быць выбранымі ў Советы дэпутатаў працоўных.

Грамадзяне Совецкага Саюза цалкам выкарыстоўваюць гэтыя вялікія правы. На выбарах у Вярхоўныя Советы СССР, Саюзных рэспублік і мясцовыя Советы гэта наглядна было прадэманстрыравана. Новыя грамадзяне Совецкага Саюза—працоўныя былой Заходняй Беларусі на прайшоўшых выбарах дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР паказалі, што яны моцна згуртаваны вакол комуністычнай партыі, што совецкая ўлада з'яўляецца для іх самай блізкай і роднай. Няма сумнення, што ў прадстаячых выбарах працоўныя заходніх абласцей яшчэ раз пакажуць сваю адданасць радзіме.

Зараз у гарачыя дні перадвыбарчай кампаніі кожны працоўны яшчэ і яшчэ раз успамінае сваё мінулае, параўноўвае яго з сучасным, асмыслівае велізарнейшыя змены ў жыцці, якія прышлі разам з Совецкай уладай.

Не многім больш 13 месяцаў прайшло з таго часу, як магутная Чырвоная Армія вызваліла нашых адзінакроўных братоў і сясцёр з-пад ігa польскіх паноў. Якія цудоўныя змены адбыліся за гэты час на вызваленай зямлі. Кожны працоўны адчуў сябе гаспадаром жыцця. Кашмарныя законы капіталістычнага грамадства—беспрацоўе, нішчата, эксплаатацыя чалавека чалавекам з корнем і навекі знішчаны. Народ адчуў радасць творчасці і сазідання. Па-новаму пачалі працаваць фабрыкі і заводы без капіталістаў, па-новаму зажылі сяляне без памешчыкаў. І з цяжкага ярма праца стала справай чэсці, доблесці і гeройства.

Выбарчая кампанія выклікала новы вытворчы ўздым. Рабочыя і работніцы, інжынерна-тэхнічныя работнікі бяруць на сябе абавязацельствы павялічыць выпуск і палепшыць якасць прадукцыі. Прывядзем некалькі прыкладаў. На Пінскай запалкавай фабрыцы імені 17 верасня растуць рады многастаночніц. Тут лепшыя машыністкі верхняга карабка тт. Чукель, Розенберг, Бойм і другія стаханаўкі сталі ў апошні час значна перавыконваць план. Калектыў Ломжынскага цагельнага завода абавязаўся выпусціць да 15 снежня 1 мільён штук цэглы звыш плана. Значна палепшылі сваю работу чыгуначнікі станцыі Маладзечна. Такі-ж вытворчы ўздым наглядаецца ў вёсцы сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях намнога палепшыла пастаноўку агітацыйна-масавай работы сярод насельніцтва. Тысячы агітатараў працуюць тут з большэвіцкім запалам. Яны нясуць у масы праўду аб нашым жыцці, аб нашай краіне. Сярод агітатараў вялікая колькасць жанчын. І гэта зусім невыпадкова. Жанчыны заходніх абласцей БССР, як і ўсе жанчыны вялікага Совецкага Саюза—будаўнікі соцыялістычнага грамадства, таму яны і зараз актыўна ўключыліся ў выбарчую кампанію. Задачай кожнай партыйнай арганізацыі на месцах з'яўляецца яшчэ большае ўцягненне жаночага актыва ў пачэсную работу агітатараў.

Рэшткі варожых класаў, царкоўнікі, ксяндзы, равіны і ўсякая контррэволюцыйная нечысць безумоўна будуць імкнуцца пашкодзіць выбарам. Нашы большэвіцкія агітатары разам з партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі павінны гэта ўлічыць і своечасова выкрываць і прасякаць усякія варожыя дзеянні.

Працоўныя заходніх абласцей вылучылі для работы ў выбарчыя камісіі лепшых сваіх прадстаўнікоў. Сярод іх таксама многа жанчын. У склад Беластоцкай абласной выбарчай камісіі ўваходзіць Рэгіна Каплан, былая палітзняволеная, якая доўгія годы тамілася ў засценках польскіх турмаў. Калгасніца арцелі імені Молатава, Жабчыцкага раёна, Еўгенія Антонаўна Макарэвіч вылучана намеснікам старшыні Пінскай абласной выбарчай камісіі. Маладая калгасніца-комсамолка Надзежда Сідараўна Вайтуль сходам калгаснікаў арцелі імені Сталіна вылучана ў склад Ляхавіцкай раённай выбарчай камісіі. Такіх імён можна назваць сотні. Гэта яшчэ раз наглядна пацвярджае той факт, што жанчыны ў СССР карыстаюцца аднолькавымі правамі з мужчынамі.

Адданейшых сваіх дачок і сыноў, на справе даказаўшых уменне змагацца за ідэі Леніна—Сталіна, працоўныя заходніх абласцей вылучаць кандыдатамі ў дэпутаты Советаў працоўных. І тыя, каму будзе аказана гэта высокае давер'е, пастараюцца працаваць так, каб апраўдаць званне народных выбраннікаў.

У прадстаячых выбарах жанчыны заходніх абласцей Беларусі, разам з усімі працоўнымі, яшчэ раз прадэманструюць перад усім светам сваю згуртаванасць вакол комуністычнай партыі, вакол любімага правадыра народаў таварыша Сталіна. Стаханаўскай работай на прадпрыемствах, установах і калгасах яны сустрэнуць гэты знамянальны ў іх жыцці дзень. Стопроцантным галасаваннем за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных яшчэ больш умацуюць магутнасць сваёй бацькаўшчыны.

Елена Сельм.

ГАДАВІНА ЎСЕІХ ПРАЦОЎНЫХ

Калі гляджу ў прасторы мінулага, я бачу гэты дзень у фарбах крыві. Вось год, у які ў кастрычніцкі поўдзень вуліцы Варшавы былі запоўнены натоўпамі рабочых. Над чорным натоўпам, як полымя, развяваецца чырвоны сцяг. Магутным патокам імкнецца ўперад народная хваля, а з крайніх вуліц злавесна, моўчкі на яе наступае сіні цень паліцыі. Як бура грыміць унушальна і грозна «Інтэрнацыянал», як гром раздаюцца выстралы. На бруку ў праменнях кастрычніцкага сонца чырванеюць цёмныя лужыны крыві.

Або другі год. За высокай турэмнай сцяной з чырвонай цэглы—невялікі двор. Прахаджваемся па гэтаму двару адзін за другім, як коні, якія цягнуць прывад малатарні. Ні адзін твой рух, ні адно, нават шэптам сказанае, слова не пройдзе міма ўвагі наглядчыцы турмы. У яе вачах ззяюць аганькі нянавісці, погляд усмірыцеля «небяспечных» і бескарысна прывучваемых звяроў.

На нашым адзенні, як маленькія палаючыя сэрцы, чырванеюць банцікі. Нам прыслалі іх на гэты дзень сябры на свабодзе і толькі мы ведаем колькі смякалкі і хітрасці трэба было прымяніць, каб гэтыя лентачкі маглі папасці да нас, каб здолець іх захаваць да сёнешняга святочнага дня—да гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі.

Пастаянна і павольна адна за другой кружымся па пыльнаму двару. За мной і перада мной кагосьці мучае цяжкі кашаль. Гэта таварышы-падругі сухотныя. Адной з іх у польскай дыфензіве адбілі лёгкія гумовымі палкамі. Другую тры тыдні трымалі зусім голай у лёдавым карцэры. Вакол мяне апухшыя ад голаду твары. колеру зямлі.

Ведаем, што з усіх турэмных акон і карыдораў у чаканні глядзяць на нас варожыя вочы. Ахова памятае аб нашым свяце і гатова на наш першы выклік рынуцца на двор.

Але ведаем і аб другім: увесь свет, працоўныя ўсяго свету святкуюць гэты дзень. Якімі бледнымі і малюсенькімі ў параўнанні з усім здаюцца нам турэмныя цагляныя сцены, краты на вокнах і варотах. Чым яны могуць нам перашкодзіць? Мы-ж разам з усімі,—з усім светам з'еднаны нашы сэрцы, імкненні ўсіх—нашы імкненні.

Раптам з нашых вуснаў нясецца мелодыя «Інтэрнацыянала», плыве над намі як птушка і падае, нібы прабітая куляй. На невялікім турэмным двары цёмныя лужыны крыві, якая прасачваецца ў зямлю.

А затым яшчэ год. Год мук, год нястач, вандравання па зямлі, дымячай ад бомб і пажараў, па параненай, як чалавечае цела, зямлі. У гэты дзень астаноўка ў апусцелай вёсцы сярод развалін і абломкаў. Сумна глядзяць угору трубы спаленых хат. Іх жыхары даўно збеглі. Блукаюць толькі бяздомныя сабакі, для якіх нават у калодзежах не стала вады. Да дна, да самага іла выпіў яе паток, які імкнуўся к свабодзе на ўсход.

Да граніцы яшчэ семдзесят пяць кілометраў, а нашы ногі апухлі, стаміліся. Не паспеем, не можам паспець. І ў гэтым годзе яшчэ не будзем святкаваць нашай гадавіны ў нашай новай сапраўднай радзіме.

— Заспяваем? — пытаецца хтосьці з нас. І зноў сярод абвугленых хат, сярод абарванага калючага дроту плыве песня...

У гэтым годзе ўпершыню я буду святкаваць гадавіну Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі ў Совецкім Саюзе. Шчаслівая я буду думаць аб тых, назаўсёды прайшоўшых, годах, аб людзях, кроўю якіх абліты брук вуліц у дні польскай восені. І хочацца мне ўскліknуць ва ўвесь голас, звярнуцца да загінуўшых і да тых, якія жывуць штодзённа пад страхам смерці ў крывавым пажарышчы вайны, да тых, якія змагаюцца і томяцца ў турмах канцэнтрацыйных лагераў капіталістычных дзяржаў, сказаць, што мы самыя шчаслівыя з шчаслівых, мы—грамадзяне вялікай соцыялістычнай радзімы. У вялікі дзень свята ўсіх працоўных нашы сэрцы з імі, як і іх сэрцы з намі.

Беласток.

На прадпрыемствах Літоўскай ССР лепшыя рабочыя вытворчасці вылучаюцца на кіруючую гаспадарчую работу.
На здымку: Ткачыха былой фабрыкі „Плоштас" А. Ф. Швільпене—зараз дырэктар гэтай фабрыкі.
Фото Д. Чернова (Фотахроніка ТАСС).

Лепшая маталышчыца-тысячніца Магілеўскай шоўкавай фабрыкі імені Куйбышэва А. І. Волчанка (злева) навучае сваёй спецыяльнасці вучаніцу фабрычнай школы ФЗУ Н. Д. Фралову.
Фото А. Вульфовіча (Фотахроніка БЕЛТА).

У кабінеце сакратара райкома

Яшчэ гадзіна да пачатку работы, а сакратар Варашылаўскага райкома КП(б)Б тав. Рутман ужо сядзіць у сваім кабінеце, нізка схіліўшыся над кнігай. Гэта яна вывучае труды Леніна—Сталіна.

На гадзінніку дзесяць гадзін. Тав. Рутман беражліва кладзе кнігі ў стол і пачынае жывую пладатворную работу.

На прадпрыемствах разгарнулася перадкастрычніцкае сацыялістычнае спаборніцтва. Выраслі новыя кадры сацыялістычнай працы—стаханаўцы, ударнікі, многастаночнікі. Неабходна сабраць іх. Яны падзеляцца вопытам сваёй работы, раскажуць, як трэба замацаваць здабытыя поспехі. Вось чаму па гэтаму пытанню была склікана ў пачатку дня лятучка інструктароў райкомаў партыі. Былі даны даручэнні кожнаму паасобку, растлумачана, як дапамагчы пярвічным партыйным арганізацыям у правядзенні падрыхтоўчай работы да злёту стаханаўцаў.

Набліжаецца Кастрычніцкае свята. Тав. Рутман выклікала да сябе загадчыка арганізацыйна-інструктарскага аддзела тав. Лесніка і папрасіла яго паказаць план падрыхтоўкі і правядзення XXIII гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі. План быў грунтоўна прагледжан, зроблена некалькі заўваг. Канчаткова ён будзе зацверджан на бюро РК КП(б)Б.

Наведвальнікі райкома прыходзяць сюды па розных пытаннях, якія патрабуюць неадкладнага ўмяшання партыйных арганізацый, прыходзяць са скаргамі, за парадамі і інш.

Вось прышла работніца друкарні імені Сталіна. Яна хоча штосьці расказаць толькі сакратару райкома, а не другому. Тав. Рутман яе прыняла. Яна скардзіцца на тое, што выключылі з ясляў яе дзіця і просіць прыняць меры да працаўнікоў ясляў за незаконныя дзеянні. Тав. Рутман звоніць у райздраў і пытанне гэта хутка вырашаецца. Скарга задаволена.

На тэрыторыі Варашылаўскага раёна будуецца вялікі радыёзавод, пуск якога прысвечан дня Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Сакратар партбюро радыё-завода тав. Фідлер, усеўшыся ля стала сакратара райкома, падрабязна выкладае свае меркаванні наконт пуска завода, расказвае аб праробленых мерапрыемствах па падрыхтоўцы да гэтай адказнай справы. Калі закончылі з вырашэннем першага пытання, тав. Фідлер прапануе ўвазе т. Рутман другое—важнае рашэнне партыйнага бюро. На заводзе рыхтуюцца да правядзення палітдня. Тав. Рутман тут-жа выклікала загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі і прапанавала дапамагчы партыйнаму бюро прапагандысцкімі сіламі.

Сакратар партарганізацыі Акадэміі Навук БССР тав. Абугаў таксама прышоў параіцца. Партыйная арганізацыя Акадэміі Навук рашыла заслухаць на партыйным сходзе двух камуністаў—навуковых работнікаў аб тым, як яны практычна рэалізуюць свае распрацаваныя навуковыя труды. Тав. Рутман раіць, як трэба вырашыць гэтае пытанне.

Друкарня імені Сталіна доўгі час была ў вялікім прарыве. Пасля Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня прагулы і спазненні не паменшыліся. Райком КП(б)Б выклікаў дырэктара Паліграфтрэста тав. Пінхасіка і яны разам абмеркавалі, якія меры прыняць для палепшання работы друкарні.

Тав. Рутман ведае, што жывое кіраўніцтва патрабуе сапраўднай сувязі з масамі, таму яна часта бывае на прадпрыемствах і ўстановах раёна. У гэты дзень яна таксама пабывала ў некалькіх партарганізацыях.

Да тав. Рутман прыходзяць жанчыны і мужчыны—партыйныя, беспартыйныя параіцца па бытавых пытаннях. Вось напрыклад прыходзіў сакратар партыйнай арганізацыі тав. Н. У яго ў сям'і непаладкі. Ён прышоў параіцца, як быць. У гэты-ж дзень прыходзіла адна беспартыйная жанчына. Муж яе камуніст, але да яе ён адносіцца дрэнна. Яна прасіла выклікаць яго ў райком і пагутарыць з ім.

Варашылаўскі райком КП(б)Б правёў вялікую работу па выхаванню і вылучэнню камуністак на партыйную работу. Сакратарамі пярвічных партыйных арганізацый працуюць: на фабрыцы «8 сакавіка»—тав. Марон, сакратаром партбюро пачатковых і сярэдніх школ—тав. Буклей, у горкомхозе—тав. Гофман, другога клінічнага гарадка—тав. Саўчанка і многа другіх.

Выконваючы складанейшую партыйную работу, тав. Рутман упітала новыя сацыялістычныя адносіны да людзей. Яна змагаецца за выхаванне новага чалавека.

Г. Геніна.

Запяткі санітарнага звяна швейнай фабрыкі „Кастрычнік" (Мінск) па вывучэнню процівагаза. Кіруе звяном актывістка абароннай работы учотчыца А. С. Давідоўская.

Фото Л. Папковіча (Фотахроніка БЕЛТА).

Шлях БАТРАЧКІ

— Як зараз памятаю,—гаворыць Александра Федасюк,— сваю пачарнелую старую хатку, з вакенцамі, што пакасіліся, і глінянай падлогай. У гэтай хацінцы пакутвалі ў беднасці і голадзе мае шэсць малодшых сясцёр і братоў. На маленькім кавалку зямлі не магла пракарміцца вялікая сям'я, і бацьку прыходзілася пакідаць сям'ю і ісці ў заработкі...

Александра, як самая старэйшая ў сям'і, вымушана была пакінуць бацькоў і пайсці батрачыць.

Першы год дзяўчынка працавала ў кулака вёскі Андронава—Дарафея Леўкуна. Уначы коней пасла, а днём поле баранавала. Акрамя гэтага прымушалі працаваць яшчэ ў хаце. Ад бяссонных начэй маленькая дзяўчынка засыпала на-хаду, за бараной спатыкалася, робячы вялікія кругі на кулацкім полі. Працаваць было цяжка. Выхадных дзён яна не ведала. За што-ж так многа працавала дзяўчынка? За гаспадарскія «харчы», без капейкі грошай, а бацькі і гэтым былі задаволены—дачка не была ў іх лішнім ротам.

Так ад кулака да кулака пераходзіла батрачка. Усюды чакалі яе тая-ж нечалавечая праца і лаянка гаспадароў. Калі заканчваліся сезонныя работы, дзяўчынку звальнялі. Яна тады ішла ў горад Кобрын, станавілася на тым месцы базарнай плошчы, дзе людзі чакалі працы.

Пасля доўгіх клопатаў і просьб Александра пачала працаваць у пякарні. Тут ля раскаленай печы людзі працавалі па 16—18 гадзін у суткі, падаючы ад жары і стомленасці.

Рана памерлі бацькі Александры. Малыя дзеці пайшлі хто куды. Александра Федасюк з вялікімі цяжкасцямі навучылася чытаць і пісаць. Далей вучыцца не магла, пайшла няньчыць памешчыцкіх дзяцей. Там яна ўбачыла вялікую розніцу паміж дзецьмі багатых і дзецьмі бедных. Стала чытаць забароненыя польскім урадам кнігі. Незабыўнае ўражанне асталося ў Александры ад кнігі Горкага «Маці». Кнігі і жыццё натхнялі яе на барацьбу за народнае шчасце, за свабоднае жыццё. У яе зарадзілася нянавісць да паноў і багацеяў-эксплаататараў.

У 1925 годзе тав. Федасюк упершыню ўдзельнічала ў першамайскай дэманстрацыі, у часе якой паліцыя жорстка збівала дэманстрантаў. Гаспадар прагнаў дзяўчыну, як «западозраную» у бунтаўстве. Гэта яе не спалохала, а наадварот выклікала новае імкненне да барацьбы. Тав. Федасюк пачала прымаць актыўны ўдзел у рабоце падпольнай арганізацыі.

З таго часу за ёю па пятах, як цень, хадзіла паліцыя. Пачаліся арышты, пагрозы, збіенні. У 1927 годзе тав. Федасюк схапіла паліцыя пры выкананні задання падпольнай арганізацыі і пасадзіла ў турму. Чатыры месяцы яна пакутвала ў турэмных казематах. Здавалася канца не будзе штодзённым допытам, здзекам. Аднак цвёрдую волю дзяўчыны не ўдалося зламаць.

Была абвешчана «кауцыя» (выкуп да суда). Для таго, каб выйсці на свабоду да суда трэба было ўнесці 500 злотых. Дзе-ж магла ўзяць бедная дзяўчына такую суму? Аб гэтым даведаліся яе таварышы. Яны арганізавалі збор грошай сярод насельніцтва. Спачуваючых было многа. За адзін дзень была сабрана неабходная сума. У адной толькі вёсцы Андронава, дзе нарадзілася тав. Федасюк, сабралі 90 злотых. Аднавяскоўцы давалі апошняе.

Апынуўшыся на свабодзе, Александра перайшла на нелегальную работу. Новагрудак, Вільна, Брэст, Варшава—гэтыя гарады добра вядомы тав. Федасюк. Ёй прыходзілася тут працаваць па заданню падпольнай арганізацыі.

Калі неба Заходняй Беларусі пакрылася сталёвымі птушкамі, калі праімчаліся грозныя калоны совецкіх танкаў, тав. Федасюк паспяшалася ў сваю родную вёску. Там, дзе яе ведаюць так добра, яна ведала, будзе шырокае поле дзейнасці, работы.

З прыходам чырвоных войск у вёску Андронава, адразу-ж быў выбран сельскі камітэт. Старшынёю яго сяляне аднадушна абралі тав. Федасюк. Работы быў непачаты край: трэба было правільна размеркаваць памешчыцкую зямлю сярод сялян, аказаць дапамогу бедным, весці барацьбу з асаднікамі і кулакамі.

Зараз Александра Федасюк абраннік народа—дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, старшыня выканкома горада Кобрына.

Т. К. Зомаў.

У Брэсце адкрыта абласная выстаўка дасягненняў за год работы прамысловасці і сельскай гаспадаркі.
На здымку: Наведвальнікі аглядаюць экспанаты калгасаў. Фото С. Грына.

Кандыдат навук

Увесь дзень дысертантка хадзіла трохі ўсхваляваная. Звычайна спакойная, яна не магла цяпер уседзець на адным месцы—усё думала аб тым, што прадстаяла. Тым часам у зале пасяджэння Навуковага Совета Маскоўскага Дзяржаўнага Педагагічнага Інстытута сабраліся навуковыя работнікі, аспіранты, студэнты. Дворкіна ўзышла на кафедру і канспектыўна ізлажыла аб'ёмістую сваю гадавую працу.

У аспірантуру па спецыяльнасці ўсеагульнай літаратуры яна паступіла ў канцы 1930 года, пасля паспяховага сканчэння літаратурнага аддзялення Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта. Маючы вялікую прыхільнасць да навукова-даследчай работы, яна ўсебакова прапрацавала кандыдацкі мінімум па спецыяльнасці. Гэта сказалася, вядома, і на распрацоўцы тэмы дысертацыі аб Фердзінандзе Фрэйліграце. Тады яшчэ гэты пісьменнік быў мала вядомым совецкаму чытачу. Блізкі прыяцель Маркса ў 1848 годзе, саратнік «Саюза Комуністаў» ён уяўляў вялікі інтарэс.

Маладая вучоная ўнесла многа новага ў ацэнку творчасці Фрэйліграта, у прыватнасці аб яго месцы ў пазнейшай нямецкай рамантыцы, аб прынцыпах палітычнай паэзіі ў «Новай Рэйнскай Газеце», рэдагуемай Марксам. Дысертацыя атрымала высокую ацэнку і Юдзіф Дворкінай была прысуджана вучоная ступень кандыдата філалагічных навук.

Сем год Юдзіф Абрамаўна Дворкіна, цяпер ужо маючая званне дацэнта, вядзе курс усеагульнай літаратуры ў Мінскім педагагічным інстытуце і Беларускім Дзяржаўным універсітэце. Студэнты паважаюць Дворкіну. Чытае яна захапляюча, вобразна і галоўнае—змястоўна. Яна патрабуе ведаў ад студэнтаў, але разам з тым патрабавальна і да сябе, сістэматычна паглыбляе свае веды.

Тав. Дворкіна прадаўжае навукова-даследчую работу. Нядаўна ў «Вучоных запісках» Мінскага педінстытута былі апублікаваны яе новыя работы аб выдатных прадстаўніках рэволюцыйнай літаратуры 40-х гадоў Германіі—Гервіга і Бюхнера. Даследуючы іх ролю ў стварэнні нямецкай рэволюцыйнай паэзіі, Дворкіна, напрыклад, абвергла ўстанавіўшыйся погляд у нямецкай буржуазнай крытыцы на Бюхнера, як на паэта-песіміста. У яе трактоўцы Бюхнер выступае як сапраўдны рэволюцыйны паэт.

Юдзіф Абрамауна Дворкіна.

Працуе яна і над праблемамі творчасці вялікага нямецкага паэта Гейне. Яна напісала грунтоўны ўступ да пераклада выбраных вершаў Гейне на беларускай мове, які друкуецца.

Вялікі ўдзел прымае кандыдат навук і ў стварэнні падручніка па гісторыі беларускай літаратуры. Ёй належаць работы аб творчасці беларускіх пісьменнікаў Самуйлёнка і Крапівы, аб газеце «Наша ніва» і беларускай літаратуры напярэдадні дваццатага стагоддзя. Яна прымае вялікі ўдзел у грамадскім жыцці Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі, з'яўляючыся членам Бюро секцыі крытыкаў.

Ужо некалькі год як Юдзіф Абрамаўна накапляе, збірае матэрыялы для доктарскай дысертацыі. Тэмай дысертацыі яна выбрала свайго любімага паэта Гейне. Нястомна ісці ўперад, удасканальвацца па сваёй спецыяльнасці—такі дэвіз Юдзіф Дворкінай.

* * *

Гадзіна ночы. Юдзіф Дворкіна пры святле настольнай электрычнай лампы паглыбілася ў чытанне «Матэрыялізма і эмпірыякрытыцызма» Леніна. Радам ляжыць агульны сшытак, куды яна заносіць асноўныя думкі класікаў марксізма. У класікаў марксізма-ленінізма чэрпае яна натхненне для сваёй работы, у іх яна вучыцца правільнаму падыходу да з'яў літаратуры, гісторыі і жыцця.

І. Самойлаў.

НЯХАЙ ЖЫВЕ БРАЦКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА РАБОЧЫХ, СЯЛЯН І ІНТЭЛІГЕНЦЫІ НАШАЙ КРАІНЫ!

Падзяка роднаму Сталіну

Нарадзілася я ў вёсцы Зіновічы, былога Лідскага павета, воласці Лебеда. Сям'я была вялікая—8 чалавек. Пасля смерці бацькі асталося 6 дзяцей. На маленькім кавалачку зямлі маці цяжка было гадаваць нас. Будучы дзяўчынкай я пайшла працаваць да памешчыка. Працавала па 18 гадзін у дзень, за гэта атрымлівала 30 грошаў. Пра вучобу і марыць не магла.

Каб аблегчыць сваё жыццё, 15-гадовай я выйшла замуж. Але жыць стала яшчэ горш. Мужа забілі на імперыялістычнай вайне. І зноў прышлося пайсці да памешчыкаў і купцоў. Я, як і многа другіх жанчын, пераносіла жорсткую эксплаатацыю пры панаванні польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

З прыходам Чырвонай Арміі працоўныя былой Заходняй Беларусі знайшлі сваё шчасце і сапраўднае жыццё. Я ў мінулым забітая, непісьменная, зараз з'яўляюся дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. 12 год працую на фабрыцы «Ардаль» (г. Ліда). Цяпер працую па-стаханаўскі на двух працэсах, на якіх раней працавалі дзве работніцы. Дзённую норму выконваю на 150 процантаў.

За адданую работу кіраўніцтва фабрыкі прадставіла мяне да ўзнагароды значком «Отличник социалистического соревнования легкой промышленности СССР». У гэтым годзе я прымала ўдзел ва ўсесаюзнай нарадзе актыва лёгкай прамысловасці ў горадзе Маскве. Я атрымала добрую кватэру. Райком партыі выдзяліў настаўніка, які вучыць мяне грамаце на даму.

Працую я ў пятым канвееры. Наш канвеер спаборнічае з 8 і 9 канвеерам. У сацыялістычным спаборніцтве мы занялі першае месца па колькасных і якасных паказчыках. Цэх, у якім працую я, увесь час трымае пераходны чырвоны сцяг. К знамянальнай гадавіне 17 верасня—дню вызвалення Заходняй Беларусі ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў наш канвеер выканаў план на 120 процантаў.

За час існавання совецкай улады непазнавальна вырас добрабыт рабочых фабрыкі. На фабрыцы працуе дзіцячы сад, ёсць свой клуб. Хутка пачнуць працаваць сталовая і дзіцячыя яслі. У гэтым годзе больш 25 рабочых правялі свой водпуск у дамах адпачынку і больш 15 пабывала на курортах.

Я, як абраннік народа, уважліва прыслухоўваюся да заяў і скарг працоўных. Заўсёды па магчымасці стараюся задаволіць іх просьбу. Работніца фабрыкі тав. Тарашкевіч, якая мае 7 дзяцей, жыла ў вельмі дрэннай кватэры. Па майму хадайніцтву яна атрымала добрую кватэру. Дырэктар фабрыкі выдаў ёй грашовую дапамогу. Такіх прыкладаў можна прывесці многа.

Святкуючы 23-го гадавіну Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі, я ад душы дзякую партыі, роднаму Сталіну за радасць, шчасце і поўнацэннае жыццё.

Браніслава Грыгор'еўна Казлоўская, работніца фабрыкі «Ардаль», дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Трактарыстка Клешчэльскай МТС, Брэсцкай вобласці, Маруся Омеляновіч у першы год сваёй работы на трактары дабілася выдатных рэзультатаў. Гадавы план работы яна выканала на 150 процантаў. Фота В. Лупейко (Фотахроніка БЕЛТА).

Аб новым жыцці

Партыя і совецкі ўрад умела вырошчваюць людзей смела вылучаюць жанчын на кіруючую работу.

Сёння я — член урада, учора—служанка, потым фабрычная работніца. Сёння — памочнік начальніка цэха, некалькі месяцаў таму назад работніца гэтага-ж цэха, прадзільшчыца. Вызваленая ад класавага гнёту беластоцкая працоўная жанчына смела ідзе ўперад, працуе на кіруючай рабоце на прадпрыемстве, упраўляе дзяржавай. Я не адна, не выключэнне, маё жыццё—гэта адзін з шматлікіх прыкладаў. Уся мая гісторыя нескладаная, а самая звычайная.

Я не памятаю, каб калі-небудзь, будучы маленькай, магла свабодна павесяліцца. Маці працавала на фабрыцы па 12 гадзін у суткі. Нас, дзяцей, было ў яе семера. Прышлося мне, самай старшай, кінуць школу і няньчыць дзяцей. Малодшаму было 12 тыдняў. Маці магла яго накарміць толькі ў абед. Калі галодны брат плакаў, я савала яму ў рот трапку з жаваным хлебам.

Непрыкметна я падрастала, прышлося падумаць аб заработках.

У 14 год, я ўзялася няньчыць чужых дзяцей. 17 год я ўжо пайшла працаваць на фабрыку. Галадала як усе. Прымала ўдзел у ўсеагульных забастоўках беластоцкіх тэкстыльшчыкаў у 1933—1937 г., у генеральных палітычных забастоўках супроць грабяжа соцыяльнага страхавання, супроць рэакцыйнага парадка выбараў.

З прыходам Чырвонай Арміі перада мной адкрыліся новыя нябачаныя магчымасці. Народ абраў мяне—простую работніцу—дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.

Я стараюся апраўдаць вялікую чэсць адданай, упартай працай. З'яўляюся членам пленума фабкома першага камбіната і членам прэзідыума абкома шарсцянікаў, заседацелем народнага суда.

Як дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, займаюся пытаннем палепшання бытавых умоў рабочых. Дапамагаю рабочым атрымліваць кватэры. Аказала дапамогу штопальшчыцы Карчынскай, якая мае чатырох дзяцей. Яна ўжо не мерзне больш на брудным цёмным чардаку. Сям'я Лашыцкага таксама атрымала кватэру.

На нашай фабрыцы шырока разгорнут стаханаўскі рух. З радасцю гляджу я на сваіх таварышоў-стаханавак Сцефанію Барташук, Софію Шчэдрук, Надзею Шчыткоўскую, Інду Кашэнюк, Фаню Шалмук, якія працуюць на 2—4 станках і перавыконваюць нормы.

Мы будзем працаваць яшчэ лепш на ўмацаванне абароннай і гаспадарчай магутнасці нашай краіны, для далейшага росквіту соцыялістычнай радзімы.

Пятроўская, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Беласток.

У Горацкім сельскагаспадарчым тэхнікуме імені Леніна (Магілеўская вобласць). Студэнткі 3-га курса, дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тт. С. Ю. Міклашэўская (злева) і А. І. Югасева за работай у агранамічнай лабараторыі.
Фота В. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА).

Галоўнае, асноўнае ў большэвізме і ў рускай Кастрычніцкай рэволюцыі ёсць уцягванне ў палітыку іменна тых, хто быў усяго больш прыгнечан пры капіталізме.

(В. І. Ленін)

У вёсцы Шайцерава

Па роўнай дарозе хутка імчалася аўтамашына. Мінуўшы Цястоўскі сельсовет, яна павярнула ўлева—у вёску Шайцерава. Там, на вуліцы ля вялікага будынку, на якім красавалася шыльда з надпісам «Праўленне калгаса «Новы шлях», машына спынілася. З кабінкі вышла маладая дзяўчына ў замаслены камбінезоне і накіравалася ў праўленне. На парозе яна сустрэлася з старшынёй калгаса Соф'яй Нікіфараўнай Шыманскай.

Ветліва прывітаўшыся, шофер паведаміла, што за дзень яна ўжо зрабіла тры рэйсы—адвезла бульбу на здатачны пункт у лік абавязковых паставак дзяржаве,—план выканан. Потым запыталася:

— А цяпер, што загадаеце рабіць?

Даўшы распараджэнне адвезці капусту, старшыня пачала расказваць аб поспехах свайго калгаса, аб яго людзях.

— У нас ёсць механікі, аграномы, трактарысты, камбайнеры. Жанчыны па авалодванню ведамі не адстаюць ад мужчын. Ёсць у нас шофер, брыгадзір, трактарыстка — жанчыны. Усе яны працуюць добра.

Добра кіруе калгасам «Новы шлях» Соф'я Нікіфараўна Шыманская. Яна ўмела арганізавала працу ў калгасе. Высока ўзняла працоўную дысцыпліну.

Уборачная кампанія ў гэтым годзе праходзіла ў неспрыяльных кліматычных умовах. Задача кожнага калгаса, калгасніка была—убраць багаты ўраджай без малейшых страт. Для калгаса «Новы шлях», які з'яўляецца насеннаводчым, яна была яшчэ больш адказнай. Тут вырашчваецца зярно новага, высокаякаснага сорту—насенне для многіх калгасаў Совецкай Беларусі. Гэта добра разумеюць калгаснікі, і таму ўпартай стаханаўскай работай яны дабіліся, што стопудовы ўраджай з гектара быў убран з поля за кароткі час і без страт.

Камбайн і другія сельскагаспадарчыя машыны працавалі кругласутачна: днём на ўборцы збожжа, а ноччу на малацьбе. Адначасова была арганізавана здача зярна дзяржаве. Калгас першым па раёну поўнасцю разлічыўся па ўсіх відах паставак з дзяржавай.

... Многія з калгаснікаў памятаюць старую дарэволюцыйную вёску Шайцерава з яе хаткамі, што пакасіліся і ўраслі ў зямлю, з бруднымі вуліцамі. Памятаюць вузкія палоскі зямлі, уздоўж і ўпоперак парэзаныя межамі. З той зямлі знімалі бедныя ўраджаі, напалову з лебядой і другім пустазеллем.

Вялікая Кастрычніцкая Рэволюцыя змяніла аблічча вёскі Шайцерава. Не пазнаць цяпер яе. Зараз тут калгас багацейшы ў раёне. Новыя дамы, вуліцы. У цэнтры клуб, школа.

З гэтай калгаснай вёскі за апошнія годы вышла звыш 50 чалавек совецкай інтэлігенцыі. Дзеці тых, хто раней толькі марыў аб вучобе, сталі інжынерамі, настаўнікамі, урачамі, акушэркамі, камандзірамі Чырвонай Арміі.

Сем'і Шыманскага Андрэя і Шыманскага Якуба лічыліся самымі беднымі ў вёсцы. Дзе ім было думаць раней аб вучобе, калі ледзь хапала на хлеб. Толькі пры совецкай уладзе іх дзеці атрымалі вышэйшую асвету.

Дочкі Андрэя Шыманскага Лёля і Тамара па сканчэнні Ленінградскага электра-тэхнічнага інстытута працуюць інжынерамі на прадпрыемствах сталіцы Совецкай ордэнаноснай Беларусі. Сын і дачка Якуба Шыманскага—настаўнікі. Другі яго сын—старшыня калгаса. Дачка Марыя—акушэрка.

Дзве сястры Глаша і Надзя Хадкевіч—настаўніцы. Яны пачалі сваю вучобу ў школе сваёй вёскі, потым вучыліся ў тэхнікуме, а зараз зноў вярнуліся ў свой раён і ўжо самі працуюць па выхаванню маладога пакалення ў комуністычным духу.

Совецкая ўлада дала працоўным вялікія правы, якія залатымі літарамі запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі—права на працу, права на адпачынак, права на асвету.

Н. Старавойтава.

Дрысенскі раён.

Калгасніца сельска-гаспадарчай арцелі „Перамога" (Скідзельскі раён, Беластоцкай вобласці) Н. Д. Семко аглядае ільновалакно ўраджаю гэтага года.
(Фотахроніка БЕЛТА).

Лепшая даярка калгаса „Прагрэс" (Ельскі раён, Палеская вобласць)—удзельніца Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 і 1940 гадоў С. С. Мазурэнка.
Фота І. Аўруцкага (Фотахроніка БЕЛТА).

Сустракаем слаўную гадавіну

Чыгуначнікі Магілеўскага паравознага дэпо рыхтуюць дастойную сустрэчу дваццаць трэцяй гадавіне Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі.

Сярод рабочых, паравознікаў дэпо шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу слаўнай гадавіны. Машыністы і памочнікі машыністаў заўсёды прыводзяць паязды на станцыю раней вызначанага часу, таксама эканомяць паліва.

Брыгада машыніста тав. Андрыеўскага да пятай гадавіны стаханаўскага руху правяла па ўчастку Жлобін—Орша поезд цяжкай вагі на 2 200 тон вышэй нормы. За высокую якасць работы нашу брыгаду прэміравалі некалькі разоў. Мяне, як памочніка машыніста, узнагародзілі значком «Ударнику Сталинского призыва». Раней я была ўзнагароджана значком «Почетному железнодорожнику». Мы водзім паязды з перавыкананнем тэхнічнай скорасці на некалькі кіламетраў.

На нашым вузле праводзіцца палітвыхаваўчая работа сярод чыгуначнікаў. Усе рабочыя змагаюцца за правільнае ажыццяўленне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня г. г. Значна скараціўся лік прагулаў. На многа вырасла прадукцыйнасць працы. Скарацілiся прастоі вагонаў. Павялічыўся процант адпраўлення паяздоў па графіку.

Я люблю паравоз, ганаруся сваёй работай. Мая работа вельмі цікавая, але адказная. Я значна вырасла на ёй і цяпер сама сябе не пазнаю.

Некалькі год назад была непісьменнай, працавала на розных работах, потым на швейнай фабрыцы імені Валадарскага. Вучылася ў вячэрняй школе без адрыву ад вытворчасці, скончыла шэсць класаў. Пасля гэтага паступіла на курсы памочнікаў машыністаў. Цяпер ваджу паязды—працую памочнікам машыніста ўжо другі год. Мяне выхавала партыя, Ленінскі Комсамол, рабочы калектыў.

Узнагароды, якія я атрымала ад наркома, стараюся апраўдаць сваёй чэснай і добрасумленнай работай. Свой паравоз трымаю заўсёды ў чыстым, культурным становішчы. Зараз я працую над павышэннем сваіх ведаў па спецыяльнасці. Рыхтуюся стаць машыністам, каб самастойна вадзіць таварныя і пасажырскія паязды і гэтым самым быць яшчэ больш карысным для нашай дзяржавы.,

Марыя Закрэўская—
памочнік машыніста.

Магілеў.

Адкрыццё рабочых клубаў на заводах і фабрыках Літоўскай ССР. На здымку: Работніцы шакаладнай фабрыкі ў г. Каўнасе рыхтуюць да адкрыцця свой новы рабочы клуб.
Фото Д. Чэрнова (Фото ТАСС).

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАШ ПАБЕДАНОСНЫ РАБОЧЫ КЛАС!

ВАЕННЫ ЎРАЧ

У карыдоры пачуліся крокі. Нехта пастукаў у дзверы. У кабінет увайшла медыцынская сястра Бычкоўская.

— Клаўдзія Владзіміраўна, машына з раненым...

Урач Шэцяшына на-хаду зашпіліла халат і выбегла на вуліцу. Праз мінуту на аперацыйным стале ляжаў малады чырвонаармеец з раздробленай ступнёй.

Клаўдзія Владзіміраўна агледзела рану. Прамыла яе цёплай вадой. Хворы заскрыгатаў зубамі ад болю і нервова схапіў руку ўрача. З цяжкасцю ён выгаварыў тры словы:

— Выратуйце мне нагу!

Клаўдзія Владзіміраўна ласкава глянула на байца і паціснула яму руку.

— Добра, таварыш, я зраблю ўсё, каб выратаваць вашу нагу.

Урач падышла да акна, паклікала сястру Бычкоўскую.

— Ведаеце, Клеапатра Леанідаўна, я баюся за хворага. Рана небяспечная. Па правілах медыцыны трэба ампутыраваць нагу, але я хачу зрабіць яму аперацыю і захаваць нагу.

Клаўдзія Владзіміраўна вымыла рукі і падрыхтавалася да складанай аперацыі. Праз гадзіну яна забінтавала раненаму нагу, узяла яго руку і паслухала пульс. Сэрца хворага білася павольна. Рукі аледзянелі. Баец знаходзіўся ў непрытомнасці.

Клаўдзія Владзіміраўна пабляднела. Яе чорныя вочы зрабіліся вільготнымі.

— Што з вамі? Вы на сябе не падобны, — звярнулася да яе сястра.

— Дарагая... Няўжо ён памрэ? Вы разумееце, гэта-ж я вінавата. Хацела зрабіць лепш, а атрымалася наадварот.

Клаўдзія Владзіміраўна некалькі гадзін не адыходзіла ад пасцелі хворага. З ёю побач сядзела з задумлівым тварам Клеапатра Леанідаўна.

Клеапатра Леанідаўна Бычкоўская і ўрач Шэцяшына падружыліся за час вызваленчага марша Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Клеапатра Леанідаўна — вопытная медыцынская сястра. У годы грамадзянскай вайны 19-гадовай дзяўчынай яна аказвала дапамогу цяжка раненым чырвонаармейцам. За 20 год бесперапыннай работы яна атрымала многа навыкаў па хірургіі, пераліванню крыві, практычнага вопыту. Таму Шэцяшына ўважліва прыслухоўвалася да яе парад.

Вечарам, калі сонейка скрылася за сасновым лесам і на чыстым небе адна за другой загараліся бледныя зоркі, хворы раптам адкрыў вочы і ў непаразуменні абвёў імі прысутных.

— Гэта вы, урач?—загаварыў баец.—Ці захавалі вы мне нагу?

Клаўдзія Владзіміраўна ад радасці не магла стрымаць слёз.

— Так, так,—нага захавана.

Шэрыя вочы хворага шырока адкрыліся. Ён доўга глядзеў на ўрача. Колькі падзякі было ў гэтым поглядзе.

Праз некалькі месяцаў хворы чырвонаармеец Леанід Бярозкін развітаўся з урачом.

— Вы, Клаўдзія Владзіміраўна, калі будзеце на Украіне, то абавязкова заязджайце ў наш калгас. У нас там добра. Кругом сады, зялёныя лугі.

* * *

Аднойчы ўначы Клаўдзія Владзіміраўна сядзела на дыванне. На вуліцы загудзела сірэна аўтамабіля. У кабінет унеслі паміраючага байца-кулямётчыка Раманава. Хворы ў дарозе сарваў з раны павязку і кроў пырснула фантанам. Пакуль давезлі яго да больніцы, ён многа страціў крыві. У беспрытомнасці байца палажылі на аперацыйны стол. Была дорага кожная секунда, марудзіць нельга было.

— Жыццё можна выратаваць толькі пераліваннем крыві,— сказала Шэцяшына.—Я аддаю сваю кроў.

Клаўдзія Владзіміраўна легла на аперацыйны стол. Пад яе кіраўніцтвам Клеапатра Леанідаўна ўзяла ў яе 160 кубікаў крыві. Яе пералілі чырвонаармейцу, жыццё якога такім чынам было выратавана.

* * *

У адным з выбарчых участкаў горада Брэста Клаўдзія Владзіміраўна выступала з дакладам. Яна гаварыла аб радасным шчаслівым жыцці, аб совецкіх жанчынах, расказвала аб жанчынах-лётчыцах, інжынерах і аб тым, як яна стала ўрачом.

Пасля сходу, калі прысутныя пачалі разыходзіцца па дамах, да Клаўдзіі Владзіміраўны падышло некалькі чалавек.

— Вось вы жанчына-ўрач, ды к таму яшчэ ваенны,—гаварыў высокі худы мужчына.—А у нас раней было зусім па-другому. Я скончыў медыцынскі ўніверсітэт яшчэ да імперыялістычнай вайны, але дзесяць год не меў пастаяннай работы і жыў упрогаладзь. Вось мой друг Сямён Пятровіч Міцкевіч мае вышэйшую асвету. Ён матэматык, але... кваліфікаваны афіцыянт. Ды і то гаспадар прыняў яго ў рэстаран толькі таму, што ён матэматык. Гаворыць: «Гэтага не аблічуць». Вось якія былі нашы справы.

Клаўдзія Владзіміраўна доўга расказвала ім аб шчаслівым і радасным жыцці совецкага народа. Дадому яна вярнулася позна ноччу, поўная радасных пачуццяў за сваю радзіму, за Чырвоную Армію, якая вызваліла гэтых людзей ад цяжкага панскага гнёта.

І. Тамбоўцаў.

У горадзе Пружаны (Брэсцкая абласць) адкрылася дзіцячая кансультацыя.
На здымку: Сястра Х. М. Памеранец за ўзважваннем дзіцяці.
Фота В. Лупейка (Фотахроніка БЕЛТА).

Рост фабрыкі

У 1930 годзе замест дробнай саматужнай швейнай арцелі была арганізавана дзяржаўная швейная фабрыка імені Дзержынскага. На змену дробнай саматужнай вытворчасці з пераважнасцю ручной работы, прышла новая соцыялістычная фабрыка з механізаванымі працэсамі работы, са строга рэгламентыраваным тэхналагічным працэсам.

За час існавання фабрыка выраслa, як па тэхналагічнаму аснашчэнню, так і па кадраваму саставу. Калектыў прадпрыемства цяпер мае ў сваім складзе звыш тысячы чалавек. Жанчын тут працуе 88 процантаў з агульнага ліку рабочых. З часу арганізацыі фабрыкі лік жанчын павялічыўся на 25 процантаў.

У азнаменаванне Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі фабрыка ўключылася ў перадкастрычніцкае спаборніцтва. Рабочыя, ІТР і служачыя ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў: выканаць гадавы план к 5 снежня—дню Сталінскай Канстытуцыі, даць да канца года звыш плана на 750 тысяч рублёў прадукцыі.

На заклік Харкаўскай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга швейнай фабрыкі імені Тынякова наша фабрыка абавязалася скараціць затрату часу на пашыўку вырабаў. Мы выклікалі на спаборніцтва Магілеўскую фабрыку імені Валадарскага.

Першыя дні разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва ўжо далі паспяховыя рэзультаты. Лента майстра тав. Баскіна выканала план 3 кастрычніка на 106,3 проц., а ўсе астатнія дні на 130 процантаў. Лента майстра тав. Плоткіна выконвае план на 113 процантаў.

На фабрыцы праведзена ў жыццё 36 рацыяналізатарскіх прапаноў, што дало гадавую эфектыўнасць 471.100 рублёў. Зараз у нас налічваецца 76 рацыяналізатараў, сярод іх—6 жанчын.

Карташова, намеснік дырэктара фабрыкі імені Дзержынскага.

Бабруйск.



О. М. Лешчэўская—комсамолка, памочнік капітана парахода „Владзімір Маякоўскі" (Гомельскі порт, Днепра-Дзвінскага рачнога параходства). Фото К. Якубовіча (Фотахроніка БЕЛТА).

РАДАСЦЬ СЯМ'І

Аднойчы сяджу я ў хаце, убягае мая дачка Надзя з газетай у руках. На яе твары захапляючая радасць.

— Што з табой, Надзенька?—пытаюся я.—Можа пра цябе ў газеце напісалі?—Надзя, нічога не гаворачы, разварачвае газету. Гляджу я, аж майго сына змясцілі ў газеце на здымку. Углядаюся бліжэй у свайго роднага любімага Ванечку, а каля яго стаіць Міхаіл Іванавіч Калінін і ўручае яму ордэн. Унізе пад здымкам надпіс: «Міхаіл Іванавіч Калінін уручае грамату аб прысваенні звання Героя Совецкага Саюза, ордэн Леніна і медаль «Золотая звезда» старшаму лейтэнанту Івану Міхайлавічу Кабзун». Колькі было радасці і шчасця ў тыя мінуты, калі я даведалася пра высокую ўзнагароду майго сына.

І сапраўды як-жа мне не радавацца. З якімі цяжкасцямі я яго расціла, гадавала і не раз над калыскай слёзы пралівала. Цяжка было гадаваць і вучыць, але дзякуючы совецкай уладзе ён атрымаў асвету, потым пайшоў у армію. А цяпер мой сын Герой. Як прыгожа гучыць гэта слова. Для мацеры яно вельмі дорага.

Нядаўна мой Ваня прыязджаў да нас у госці, у свой родны калгас «Праўда». Яму была наладжана ўрачыстая сустрэча. Ён расказаў нашым калгаснікам аб гераізме Чырвонай Арміі, аб яе перамогах у барацьбе з белафінамі. Расказаў і аб тым, што кулямёт, якім ён знішчаў ворага, з сямідзесяццю прабоінамі цяпер знаходзіцца ў Маскве ў музеі.

Пражыла я на свеце 74 годы, многа чаго бачыла на сваім вяку, але такой радасці я не мела ніколі. Я шчасліва за сваіх дзяцей. Усе яны працуюць. Малодшы сын Павел працуе на ваенным заводзе, тры дачкі працуюць у калгасе.

Я вельмі ўдзячна совецкай уладзе, комуністычнай партыі і роднаму Сталіну за бацькоўскія клопаты аб людзях.

Анна Якаўлеўна Кабзун,
маці Героя.

Дрысенскі раён.

В. Гуцько.

Браніслава

(Апавяданне)

Жыццё ішло, бурна імчалася яно наперад. І дзяцінства парабчанкі, дачкі аднавокага Палікара, змянілася юнацтвам. Цяпер, здаецца толькі-б і красавацца, піць хмель пары свае ў дні залатога дзявоцтва. Але-ж не. Не заўсёды так бывае, як самому хочацца. Ты да варот, а чорт, як кажуць, цераз плот. Так і тут атрымалася. Не паспела яшчэ зажыць у сэрцы рана, прычыненая смерцю маці, як на табе—новае гора пасцігла Браніславу. Зноў яна кліча зязюлю, міжвольна прымушае сябе верыць прароцтву яе, пра Міхася пытае...

Не ў садах кліча дзяўчына птушку, не ў гаях альховых на беразе шырокага Нёмана. Думкі яе былі прыкуты да возера «Зялёная хваля», адкуль здаўна род паноў Залуцкіх ласаваўся адборнай рыбай.

От ужо з гадзіну ходзіць каля яго Браніслава, глядзіць на цёмнасінюю гладзь. Яна стаяла перад ёй вокам шкляным, халодным, як далёкія нябесныя прасторы. І ў гэтай застыглай напятасці выразна выступалі стан і воблік дзяўчыны. Высокая, стройная; белакурыя валасы, прахвачаныя пасярэдзіне праборам, доўгія тоўстыя косы аблягалі грудзі; строга зведзены тонкія губы; вочы блакітныя, над якімі, нібы п'яўкі, вуглавата абходзілі прыгожыя бровы,—усё тое, што калісьці так моцна любіў яе Міхась.

Нешта цяжкае, грузнае падступала к сэрцу Браніславы, сціскала яго. От-от заплача здаецца. І раптам рысы твару становяцца строгімі, няўмольнымі. Нельга плакаць, калі вымаюць тваё сэрца, выганяючы, як сабаку, у чыстае поле на вей-вецер. Нельга плакаць, калі засеклі Нічыпарыху за куст панскага чорнагалову, пусцілі па Нёману задушанага за шчырую праўду Базылёвага сына, калі паўстанне ў двары дорага аплочана цаною крыві парабчанскай...

Трэба мацней сціскаць кулакі, вышэй узнімаць навярэджаныя плечы і стралою кідацца на душагуба-пана, хватаючы яго за самае горла.

І дачка Палікара прыжмурвае свае блакітныя вочы, зводзіць п'яўкі-бровы, становіцца тварам насустрач надыходзячай буры.

— Шкада, што няма Міхася...

... Пачатак няшчасця быў вельмі просты ды і здарылася яно гэтак-жа проста, як і ўсё вырашаецца з лёгкай рукі памутнеўшага панскага розуму.

Ішоў чэрвень 1939 года. У маёнтку радавітага пана Залуцкага адбывалася вяселле. Ён выдаваў замуж дачку за палкоўніка Жарабіцкага. І от уздумаў пан пачаставаць гасцей у час вячэры свежымі ўюнамі. Войту загадана было адправіць на возера дзесяць пар рыбакоў. У пары з чорнабрывым Міхасём, сваім каханым, вышла на лоўлю і дзяўчына Браніслава.

Пасля ўдалага заходу з трыгубіцай першым якраз і папаўся ў рукі дзяўчыны ўвесісты слізкі ўюн.

— Бачыш, Міхась, якая важная закуска? Пэўна аднаго хопіць на трох Жарабіцкіх?—жартам пачала дзяўчына. Але ў той час уюн выслізнуў і спрытна нырнуў пад шырокае лісце лілей. Браніслава толькі рукамі ўсплясnула і, заліваючыся смехам, дадала:

— Не хоча, шэльма пападацца ў зубы палкоўніка!

Міхасю спадабаўся гэты выпадак, і ён рашыў яго выкарыстаць.

— Э-эх парабчанка-рыбачанка, не жадаеш панам дабра... Ці-ж можна ўпускаць такую рыбіну? Папалася гэта табе, то ты яе, ну, пад жабры і квіта...—А потым ужо разважна і ад душы дадаў:

— Вось я, скажам, калі-б ты мне да рук прыгарнулася, то якой-бы вёрткай не была не выпусціў-бы...

На момант змоўклі. Далёка адплылі другія рыбакі. А Міхась з Браніславай на сваіх чаўнах усё бліжэй падплывалі да берагу, чаўны іх прыбліжаліся, так што кругі ад іх ужо сыходзіліся, і ад гэтага зыбалася лісце лілей, кветкі заманліва выглядвалі. Тады Браніслава наважыла сарваць іх, і думка стралою мільганула: «Толькі дзве, каб у пару былі, бо разгневаецца Міхасёк, не возьме. Трэба-ж паказаць, што не лыкам шыта дачка Палікара. Адна кветка ні да злосці, ні да мілосці—чула я».

Падалася станам на левы бок чаўна, вось-вось дастане большую, толькі човен-душагубка так закалыхаўся, што ўзрушаная паверхня возера адчула пругкасць грудзей дзявочых. Магло быць яшчэ і горш, ды толькі спрытнасць Міхася выратавала яе. І тут адбылося тое, што на ўме было ў хлопца ўжо нешта каля года: уліп ён губамі да шчакі дзявочай, шчакі з іскрынкай, з ямінкай. Пачуў толькі ціха сказанае—«як ні сорамна», але яно сышло з вуснаў дзяўчыны неяк своеасабліва і па-жаночаму ласкава.

Браніслава, абводзячы рукою па шаўкавістых валасах, з якіх сцякала азёрная вада, нейкім гнеўным голасам, што ішоў з глыбіні душы, заспявала:

Эх вы хвалі крутабокія,
Эх ты возера глыбокае...
Зарасціце мохам, травамі,
Як гібець маем на пана мы...

Песня раптам абарвалася. Якраз у гэты час, цікаваў з-за дрэў парабкоў войт Касабуцкі, «лісіца бясхвостая», як празвалі яго дваровыя. Ён усё бачыў і чуў.

— Гэ, гэ! пацук галабокі... Праца не да нораву? Паноў уздумала чарніць!? Вечарам, ліха азёрнае, да стайні...

Праз гадзіну лісіца тая ўжо стаяла з даносам перад панам.

— Высеч розгамі да паўмору, а калі ачухаецца, прывесці на пасмешышча гасцей. Паслухаем мастацтва пасля бярозавага пачастунку,—чуўся загад Залуцкага.

— Усё па-панску будзе зроблена, ваша светласць! Пяць пучкоў бярозы ўжо ёсць, мокнуць. Толькі ці не будзе сорамна пану нашаму, калі такая паганка стане перад гасцямі, каб смаку часам не сапсавала?—паціраючы чырвоны жылісты нос, услужліва лепятаў войт. Залуцкі змаўчаў. Рукой адно ўзмахнуў, сцвярджаючы сваё прыказанне.

Міхась ужо з поўгадзіны пахаджваў каля панскага куратніка, дзе пяць дужых хлопцаў канчалі выкладаць чарапіцай страху. Убачыўшы дзяўчыну, ён крыкнуў:

— Я тут, Браніслава, не бойся!

— Ды што ты... Я-ж не такая,— узняўшы вочы адказала з усмешкай дзяўчына.

Два гайдукі схапілі за красу дзявочую, за русыя косы і павалаклі на кару. Звязалі рукі, крыллі лебядзіныя, палажылі на выбітым глінішчы каля парога. Узвіліся пучкі бярозавыя, вымачаныя.

Міхась закусваў губы, сударгава рваў за крысы зрэбнай жакеткі, намерваўся кінуцца да стайні. Твар яго акамянеў, вочы, здавалася, упалі глыбока пад дугі брыўныя, загарэліся аганькамі. Не сцярпеў:

— Таварышы!.. Браткі! Да што-ж гэта такое?! Што-ж вы седзіцё, калі вашу родную кроў паганяць?!

Рвануліся хлопцы. А Пятро Крывунчык з такім трэскам зляцеў са страхі, што аж куры панскія крыллямі залопалі. Міхась ухапіў пліту чарапічную і проста да войта. Той не заўважыў парабкоў і са смакам услужлівага лёкая папраўляў гайдуцкія здзекі:

— Не проста лупцаваць, а з прыціркай... О, так, так...

— Я прытру, прытру, рыла свіняча!—заскрыгатаў зубамі ад злосці Міхась.—Прэч рукі, наймиты крыважэрныя!—і рука з плітай той урэзалася ў скуласты твар войта. Кроў заліла яму грудзі, нос прыкметна раздвоіўся. Закалыхаўся войт-вярзіла, але паспеў тузануць за вяроўку, каб даць знаць панам звонам рэйкі чыгуннай. Тузануў і асеў мяшком мякінным. Хлопцы з куратніка заламалі рукі гайдукам, павязалі. Той самы Крывунчык ухапіў бярозавы біч і давай іх хрысціць па патыліцах.

Міхась прыпаў да Браніславы. Яна ад болю вывівалася зрубцаваным целам. З рассечаных брывей кроплямі сачылася чыстая маладжавая кроў. Косы яе распляліся і пасмамі абвіліся на пасінеўшай ад розаг шыі. Усё цела ныла пякучым болем. Перама-

раючы гэта, яна з енкам перавярнулася, каб хоць крыху прыкрыць свой сорам ласкутамі насечанай кашулі.

— Любы мой, за што абняславілі? За што?!—пытала яна праз слёзы.

— Пойдзем, Бронечка,—гаварыў Міхась, падтрымліваючы яе за гнуткі стан.—Паспеем можа.

На звон рэйкі збегліся ўсе дваровыя. Загаварыла, зашумела грамада. Шум гусцеў, нарастаў, станавіўся магутным, трывожным. З левага крыла натоўпу выціснуўся Палікар—бацька Браніславы.

— Дачушка!.. Дзіця маё роднае!.. Чаму-ж гэта я, твой родны бацька, нічога не ведаў? Бег за народам, як на дзіва бег. Знявечылі цябе...

І грамада зноў загула. Цяжка было разабраць кожнае слова, але адно, самае магутнае, у якім чутна была сіла народа, узлятала высока, праносілася над галовамі, як гром навальніцы:

— Смерць!!!

— Людцы, от я, сам стары парабак,—зноў загаварыў Палікар,—кажу вам: нечага цярпець, даволі!—і буйная сляза скацілася з бацькавага вока.

І тут адбылося тое, чаго даўно баяўся род паноў Залуцкіх. Сотні кос, віл, тапароў і розных аскабалкаў узнялося ўгору. Гэта выступіў гнеў народны цераз краі доўгай цярплівасці.

Стража, што ахоўвала вясельны спакой у палацы, саранчой навалілася на паўстаўшых. Прыбеглі на ўсмірэнне і афіцэры. Панскі дзядзінец падобен быў на нейкі вадаварот. У гэты момант нейчыя спрытныя рукі віламі пранізалі паніча, афіцэра Залуцкага, які баязліва гарцаваў на белакапытым стаенніку.

Жаніх Жарабіцкі нацэліўся ў чалавека, але на гэты момант падаспеў Міхась і з размаху запусціў у плечы палкоўніка цеслярскую сякеру. Адбілі рукі і самому Залуцкаму.

Натоўп накіроўваўся да палаца, толькі выкліканае войска перашкодзіла іх намеру.

Міхася Баравога, Пятро Крывунчыка, Цімоха Лесавіка, Нічыпара Перапечку і яшчэ аднаго Перапечку закавалі і недзе пагналі. Не паспелі, відаць, адвесці іх за прысады, як прагавітае полымя абняло сцены панскіх пакояў.

Трывожна стала ў маёнтку. Госці на скрут галавы лескаталі брычкамі, абмінаючы адзін другога, каб нейашкоджанымі вынесці галовы свае. Адна толькі пані Залуцкая млела каля маладой, ратунку ў бога просячы.

* * *

Толькі раніцою прышла крыху да сябе Браніслава. Сілілася прыгадаць усе драбніцы ўчарашняга дня. Але сляды катавання бралі верх. Хворую распякала гарачка. Перад ёй выступалі снасці рыбацкія; вырастала кветка-лілея, Міхась чорнабрывы... Усё мітусілася рознакаляровымі кругамі, іскрамі прарастала наваколле. І так цэлы тыдзень.

Аднак гэта не перашкаджала мучыць яе допытамі. Апынуўшыся ў пакоі следчага, яна ўсё-ж мыслена паклялася нічога не гаварыць. Жыглевіч з практыкаю бывалага шпіка спачатку кінуўся на хітрыкі:

— Выпадак з розгамі, вядома,—непаразуменне. Войт зрабіў гэта сваім адумам, і пан Залуцкі, я ўпэўнен, не даруе яму. Пан умее і мілаваць... І калі маладая бунтарка,—тут ён прыўзняўся і гаварыў, гледзячы проста ў вочы,—хоча быць у ласцы панскай, то павінна сказаць, хто рыхтаваў паўстанне, падпаліў пакоі панскія. Трэба комуністаў пералічыць.

Браніслава маўчала. Было толькі адно жаданне: кінуцца і давіць, давіць гэту гадзіну да смерці.

— Дык што-ж, языка не маеш, калі з табой гавораць? Рэволюцыяй аб'елася, голь пракаветная!

— Вар'ят!—крыкнула Браніслава.

— Мільч, холера!—прашыпеў следчы.—За жыццё—планім жыццём. За галаву вялікага палкоўніка трыццаць адсячэм! Міхась Баравы і ты—бунтары, раскольнікі. Да сотай крыві выпалім род паганы.

— Вы раскольнікі! Мы—народ забіты! Жыць хочам... жыць...—і тут змяёй уелася гумавая палка ў плечы Браніславы. А потым неяк гадка Жыглевіч плюнуў проста ў твар дзяўчыны.

Схапілі жаўнеры Браніславу, і на гэты раз яна апынулася ў сырой арыштанцкай.

Парабкі потым чулі, як енчыла краса і гордасць парабчанская. Клікала на расправу з панамі, праклінала жыццё, матку боску і самога Езуса.

Пазней, будучы арыштаванай, Браніслава дазналася, што ў чацвер, на ўсходзе сонца, павядуць на загубу яе любага Міхася. Будуць тапіць у возеры «Зялёная хваля». Цэлую ноч не зводзіла яна вачэй. Думала, гадала... А калі золак раніцы акрыліў злёгку вузкае акенца камеры, яна не знаходзіла месца: прыпадала да дзвярэй, галасіла, ламала рукі.

— Заступнік дарагі!.. Гінеш... За мяне гінеш. Дармо!.. Народ адпомсціць. А кахание... Міхасёк, я зберагу навечна. Ось тут зберагу, у самым сэрцы. Бывай!..—і да болю заломаныя рукі апусціліся далонямі да дзявочага сэрца.

Пакалечанага, закутага Міхася вялі бітым шляхам да возера. Чалавек ішоў на смерць. Яго акружала вастрыё дзесяці адточаных штыкоў.

Спахмурнела раніца ліпеньская. Нудна шумеў бор. Потым цяжкімі пераватамі разышоўся гэты шум па вершалінах лесу ды змоўк. Адна толькі зязюля палахлівым голасам азвалася, нібы спачуваючы беднай дзяўчыне, што ўтрачвае свайго дарагога сокала.

Ласкавы прамень узыходзячага сонца крануўся твару Міхася, палашчыў вочы хлопцавы і збег на хвалі азёрныя. Міхась прыкметна адчуў гэта, задумаўся. Тады перад ім паўстаў вобраз Браніславы, чаўны і кветкі, пахучыя і светлыя, як вясна, заманлівыя як вочы Браніславы.

Павярнулі тварам да возера. Глядзіць яно напятасцю, адсвечваецца малінавая зара на паверхні. Зірнуў у глыб—убачыў твар, валасы ўзлахмачаныя, кайданы на руках. Скрыгануў зубамі, узняў галаву і бясстрашна грымнуў:

— За праўду гіну, за народ! Вас, нягоднікаў, і возера не прыме. Сабакі касцей грызці не будуць!—і паў, як той падрэзаны дуб, у бяздонне азёрнае. Кругамі разышлася вада, пузырамі ўспенілася.

Сонца паволі падымалася ўгору. Час-ад-часу смутна выглядвала праз валокны хмар ды зноў хавалася, але не надоўга...

Пасля доўгіх мук, нічога не вынаўшы, выпусцілі Браніславу, аднак выгналі яе з панскага маёнтка разам з яе родным бацькам.

* * *

Ішлі дні за днямі. Праходзілі месяцы, бязрадасныя, нудныя. Шмат паспытала Браніслава гора за гэты час. Сушылі кулакі наймічку, бы каліну тую вятры асеннія, сухавеі.

Але от аднаго вечара пачула Браніслава ад людзей, што затрашчалі польскія межы, што пер'е пачаў губляць «ожэл бялы». Потым і яна сама ўбачыла, што паны заварушыліся. Невядома чаму, але ўжо лягчэй уздыхнула дзяўчына. Сэрцам нечага чакала, спадзявалася...

Ачунялі і ўсе парабкі ў маёнтку Залуцкага. Кпінамі пад'ядалі часам дзяўчаты недаспеўшую нявесту Жарабіцкага,—калом яму зямля! А афіцэр Адвэрт Залуцкі, казалі, збег недзе пасля папраўкі, каб пораху на пазіцыі не нюхаць.

— Так некалькі дзён і жылі людзі, як на жары. Але от праз два дні яшчэ нешта новае пачалося на свеце. Аднойчы раніцою застагнала ўсё, ну проста зямля колецца на часткі; свет здрыгануўся, здавалася. Звініць паветра, а вецер усходні набліжае гэты звон, росціць яго. Не да працы было цяпер людзям! Не паспелі гэта яны як след услухацца ў той дзівосны звон як дзівам нябачаным лавіна сталёвая прамчалася праз маёнтак, праз двор ды проста каля самага пакою, каламажку Залуцкага пад сябе падабрала.

— Танкі! Танкі!—чуліся няспынныя галасы.

— Совецкія танкі!

— Чырвоныя! Браты нашы родныя!..

А танкі ішлі, варочалі панскі дзядзінец, аж пыл курэў.

Воклічы «ура», прывітанні ў гонар сваіх вызваленцаў і таварыша Сталіна раслі да самых хмар. Не сціхалі. З саламяных хат, двароў, гумнаў—адусюль беглі людзі. Цяпер ім было лёгка, адно ад радасці блішчэлі на вачах буйныя слёзы.

Браніслава, трымаючы за руку свайго бацьку, стаяла на скрыжаванні палявых дарог. Яна першай хацела бачыць чырвоных воінаў, багатыроў вялікай зямлі, людзей з агністымі на шапках зоркамі. У правай руцэ яна трымала букет чырвоных руж, уздымала над галавой перад кожным сустрэчным танкам. І от адзін з іх, відаць самы магутны, абмінаючы іншых, пайшоў проста на дуплястую старадрэвіну панскую. Скрышыў, расцёр, і Браніслава не выцерпела ад радасці:

— О так, так яму, панскаму зеллю! Смерць роду Залуцкіх, роду Жарабіцкіх.—З гэтымі словамі яна кінулася проста да танкіста, падала яму ад шчырага сэрца букет. Баец, шырока ўсміхаючыся, моцна паціснуў руку дзяўчыне, падзякаваў за падарунак.

Расчулены Палікар са слязой на воку прыпаў да грудзей чырвонаармейца. Абняліся браты родныя, і вечная дружба была замацавана доўгім пацалункам.

— Шкада, што няма майго Міхася,—з жалем прагаварыла Браніслава.

ПАЛАЦ ПІОНЕРАЎ

У цэнтры ордэнаноснай сталіцы БССР—горада Мінска, на рагу вуліц Энгельса і Кірава красуецца вялікі трохпавярховы будынак—Палац піонераў і школьнікаў. Высокая каланада ўпрыгожвае яго.

Мінскі Палац піонераў і школьнікаў пабудаван у 1936 годзе, на яго выдаткавана каля чатырох мільёнаў рублёў. Па сваёй багатай аддзелцы палац адносіцца да ліку лепшых і прыгожых збудаванняў. Унутры пакоі, вестыбюлі, файэ багата аддзеланы мрамарам, люстрамі. Сцены пакояў упрыгожваюць барэльефы, мастацкія карціны, бюсты і партрэты правадыроў. Мэбля зроблена па спецыяльна распрацаваных праектах. Усе лабараторыі абсталяваны складанай тэхнічнай і электрычнай апаратурай.

Асноўнае прызначэнне палаца—даць здаровы, культурны і цікавы адпачынак дзецям, садзейнічаць шырокаму развіццю іх творчых здольнасцей, дапамагаць школе ў паглыбленні ведаў вучняў. Палац дапамагае піонерам і школьнікам вырасці развітымі, ініцыятыўнымі і актыўнымі будаўнікамі соцыялізма.

Кожны дзень Палац піонераў наведвае больш 2 тысяч школьнікаў. Яны запаўняюць яго бадзёрасцю і весялосцю. Адны прыходзяць сюды пабачыць добрую кіно-карціну, або паслухаць цікавую лекцыю, другія запісаліся ў пастаянныя гурткі і наведваюць іх адзін-два разы ў тыдзень. Усіх гурткоў у палацы каля 250. У іх займаецца больш 5 тысяч піонераў і школьнікаў.

Найбольшую ўвагу школьнікаў прыцягваюць да сябе абаронныя і фізкультурныя гурткі. Вялікая колькасць дзяцей займаецца ў тэхнічна-канструктарскіх і мастацкіх гуртках.

Школьнікі вельмі цікавяцца і чыгуначным транспартам. У добра абсталяванай транспартнай лабараторыі можна бачыць юных чыгуначнікаў за работай над канструяваннем паравозаў, вагонаў. У гэтым годзе гурткоўцы працуюць над пабудовай чыгункі вакол сцен лабараторыі.

У авіялабараторыі займаецца 350 чалавек. Тут рэбяты канструіруюць мадэлі самалётаў, планераў. Некаторыя гурткоўцы зрабілі такія авіямадэлі, якія лётаюць у паветры больш двух гадзін.

Пано „Широка страна моя родная". Работа гуртка мастацкай вышыўкі Мінскага Палаца піонераў. Фота І. Рабіновіча.

Старэйшыя школьнікі займаюцца ў планерных гуртках. Яны вучацца лятаць на планеры, каб потым перасесці на самалёт. У мінулым годзе 24 вучні скончылі планерны гурток з адзнакамі «добра» і «выдатна» і атрымалі званне пілотаў-планерыстаў.

У электрафізічнай лабараторыі гурткоўцы робяць невялікія дынама-машыны, электраматорыкі. Заканчваюць электрагармату, якая з дапамогай электра-току будзе страляць без гуку. Робяць таксама паравоз, кіруемы гукам. Лепшыя піонеры-будаўнікі Макс Грынберг, Арон Левін, Геня Краскоў.

Будучыя тэлеграфісткі-дзяўчаты вывучаюць тэлеграфную справу. Пасля сканчэння школы яны мараць паступіць у інстытут сувязі. Некаторыя гурткоўцы свае мары ажыццявілі. Вось былая наведвальніца тэлеграфнага гуртка Зоя Нахімовіч зараз займаецца ў Одэскім інстытуце сувязі. На імя дырэкцыі Палаца піонераў яна прысылае пісьмы, у якіх выносіць падзяку за атрыманыя веды.

Больш 20 чалавек, якія раней займаліся ў тэлеграфным гуртку, цяпер працуюць на Цэнтральным Мінскім тэлеграфе.

Каля тысячы піонераў і школьнікаў займаюцца ў гуртках мастацкага выхавання. У палацы ёсць гурткі: харавы, танцавальны, гурток юных мастакоў, аркестр народных інструментаў, духавы аркестр, драматычны гурток, ансамбль баяністаў і гурток мастацкай самадзейнасці.

У гуртках мастацкай вышыўкі займаецца каля 350 дзяўчатак. Рознакаляровымі ніткамі і аплікацыяй зроблен плакат на тэму: «Широка страна моя родная», «Пагранічнікі», «Піонерскі значок» і іншыя. Вучаніцы Ганчарык і Васілеўская зрабілі многа мастацкіх работ.

Юныя мастакі зрабілі больш 2 тысяч кампазіцый, эцюдаў, зарысовак і інш. 220 работ былі прадстаўлены на ўсебеларускай выстаўцы дзіцячай творчасці. Любімай тэматыкай юных мастакоў з'яўляецца абаронная. Вучань 47 школы Анатолій Сабалеўскі выканаў малюнак «Разведка», вучань 20 школы Еўгені Дзятлаў паказаў на малюнку, як вызвалены беларускі народ сустракае байцоў Чырвонай Арміі, Лазар Дукор намаляваў кампазіцыю «Чырвоная Армія ўязджае ў Мінск 11 ліпеня 1920 года».

Палац піонераў карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод школьнікаў, піонераў і дарослых. Сюды з ахвотай ідуць малышы, прыходзяць на экскурсію дарослыя. Палац наведалі дэлегацыі ад заходніх абласцей Беларусі і ад новых прыбалтыйскіх рэспублік. Ён зрабіў на іх вялікае ўражанне.

І. Талуціс, нам. дырэктара Палаца піонераў.

Як бацькі могуць дапамагчы сваім дзецям лепш вучыцца

Перад нашай школай і сям'ёй стаіць агульная пачотная задача—выхаваць будучых будаўнікоў комуністычнага грамадства. Гэта значыць—выхаваць такіх людзей, якія-б усю сваю работу, усе сілы аддавалі агульнай справе. Але для таго, каб пабудаваць комунізм трэба авалодаць ведамі. Совецкая школа з кожным годам дае дзецям усё больш трывалыя і сістэматычныя веды. Аднак і сям'я павінна таксама дапамагчы дзецям лепш вучыцца. Як могуць садзейнічаць бацькі лепшай паспяховасці дзяцей?

Бацькі павінны стварыць дзецям такія ўмовы, каб яны маглі паспяхова займацца дома. Прывядзем прыклад таго, як дрэнныя хатнія ўмовы перашкаджаюць дзецям добра вучыцца.

Бора і Каця—брат і сястра. Абодва вучацца ў 5 класе. Бора першы год, а Каця асталася на другі год. Бацька іх працуе на заводзе, маці—дома па гаспадарцы. У самым вялікім пакоі змяшчаюцца бацькі. Дзеці спяць у цёмнай палове кухні. Урокі рыхтуюць на брудным кухонным стале. Кнігі і сшыткі валяюцца дзе папала: зімой на печцы, а летам—у хляве. Дзеці загружаны хатняй работай. Спаць кладуцца позна. Бацькі не цікавяцца, як яны рыхтуюць урокі і як вучацца. Дзённікі Бора і Каця «згубілі» з самага пачатку навучальнага года, бо вучацца яны дрэнна. Гэта аднак нікольки не турбуе бацькоў.

Вучэнне ў школе сур'ёзная справа і бацькі павінны стварыць дзецям магчыма лепшыя ўмовы. У дзіцяці павінен быць асобны чысты ложак, змешчаны ў светлым месцы. Калі дзіця дрэнна выспіцца, яно будзе вялым і няўважлівым у школе.

Вучню трэба адвесці асобны куток, дзе-б стаяў столік для падрыхтоўкі ўрокаў і змяшчаліся ўсе яго кнігі, вучэбныя дапаможнікі, цацкі. Калі-ж для гэтага няма месца, то можна зрабіць палічку для яго рэчаў і адвесці пэўнае месца за агульным сталом, дзе-б ён мог заўсёды рыхтаваць урокі.

Перад тым як сесці за ўрокі, трэба праветрыць пакой (адкрыць фортачку). Трэба сачыць за тым, каб дзіця сядзела правільна, не горбілася і не апіралася грудзьмі на стол, сядзела-б так як яго вучаць сядзець у школе.

Дзеці павінны рыхтаваць урокі заўсёды ў адзін і той-жа час. Пасля школы гадзіны дзве могуць пайсці на абед і адпачынак, потым дзве-тры гадзіны на падрыхтоўку ўрокаў. Трэба спланіраваць час так, каб перад сном можна было гадзіну-паўтары пагуляць, потым своечасова легчы спаць.

Урокі карысна вучыць з маленькімі перапынкамі—мінут на пяць пасля таго, як падрыхтавана заданне па якому-небудзь прадмету. Бацькам трэба сачыць за тым, каб дзеці заўсёды ў адзін і той-жа час уставалі, рабілі ўрокі, адпачывалі, елі, лажыліся спаць.

У некаторых-жа сем'ях бывае так. Толькі сядзе Жорык за стол, адкрые кнігу і пачне чытаць уголас, як маці крычыць: «Не бубні, мне і так галава баліць». А тут пабіліся малодшыя дзеці і раздаецца плач. Усё гэта не дае магчымасці сканцэнтравацца дзіцяці, адцягвае яго ўвагу ад кнігі. Чытаючы пра сябе тое, што задана чытаць уголас, ён няправільна ставіць націскі, чытае невыразна, прапускае літары.

У доме павінен быць заведзен такі парадак: як толькі дзеці селі за ўрокі, павінна быць поўная цішыня. Трэба з павагай адносіцца да заняткаў вучняў і прывучаць да гэтага малодшых. Калі ў сям'і некалькі дзяцей вучыцца ў школе, то карысна, каб усе дзеці рыхтавалі ўрокі ў адзін і той-жа час. Тады ніхто з іх не перашкаджае адзін другому.

Не трэба адцягваць увагі дзяцей у часе заняткаў размовамі і рознымі даручэннямі. Дзіця, адарваўшыся ад кнігі, траціць многа часу, покуль зноў пачне працаваць. Дзеці павінны дапамагаць у хатняй рабоце, але не ў шкоду сваім школьным заняткам.

Бацькі павінны забяспечыць дзяцей падручнікамі, сшыткамі і ўсімі школьнымі прыладамі (алоўкамі, каляровымі і простымі, ручкай, гумкай і т. д.). Калі ў школьніка няма якога-небудзь падручніка і ён толькі калі-небудзь можа прачытаць заданы ўрок па кніжцы таварыша, то ён пачынае адставаць па гэтаму прадмету.

Ці павінны бацькі дапамагаць дзецям рыхтаваць урокі? Так, могуць, але толькі трэба рабіць гэта ўмела. Іншы раз бацькі дапамагаюць дзецям такім чынам: «Што ў цябе не выходзіць?»,—пытаецца бацька і бярэ ў хлопчыка задачнік. Падумаўшы і рашыўшы задачу сам, ён гаворыць сыну: «Ну, бяры сшытак, пішы». Такая дапамога, калі за дзіця ўсё зроблена, а яму астаецца толькі перапісаць, не прыносіць ніякай карысці. Гэта не дае ведаў вучню, развівае несамастойнасць і звычку карыстацца чужой працай. Выкананая за дзіця работа ўводзіць ў заблуджэнне настаўніка, бо ён думае, што вучань выканаў урок сам. Трэба дапамагаць дзецям толькі ў тым выпадку, калі ў іх узнікаюць цяжкасці. Тады бацька ці маці могуць растлумачыць незразумелае месца ці напомніць тое, што трэба, з раней пройдзенага матэрыяла, а далей вучань зноў працуе самастойна.

Бацькі павінны правяраць па дзённіку, што задана на дом, і потым праверыць выкананне ўрока. Настаўнік ў класе не можа кожны дзень праверыць усіх вучняў, а бацька ці маці могуць штодзённа правяраць, як выканалі хатнія заданні іх дзеці. Калі бацькі самі малапісьменныя і не могуць праверыць, як дзеці вучаць урокі, яны могуць сачыць за тым, каб пісьмовыя заданні былі чыста выкананы. Для дзіцяці і гэта мае вялікае значэнне, бо і такім чынам таксама кантраліруецца яго работа.

Ілья Нікалаевіч Ульянаў—бацька В. І. Леніна заўсёды правяраў, што вывучылі яго дзеці па кожнаму прадмету да заўтрашняга дня. Гэта прыносіла карысць і дзецям, бо пры гэтым яны яшчэ раз паўтаралі пройдзенае. Усе бацькі могуць дапамагчы сваім дзецям лепш вучыцца, калі створаць для гэтага неабходныя ўмовы ў сям'і і будуць правяраць, як дзеці рыхтуюць урокі.

Р. І. Зісман—кандыдат педагагічных навук Інстытута школ.
Мінск.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна
Міністэрства літаратуры і абавязкі
Абанемент

ЦАНА 20 КАП.

Дзіцячы сад № 1 у горадзе Рэчыцы.

Фото К. Якубовіча (Фотахроніка БЕЛТА)